ТЭАТР...
НА КАНАПЕ
5

У АДНУ РАКУ —
ДВОЙЧЫ
13

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

24 САКАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 56 (29936)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Важная задача — замацаванне маладых кадраў. Для гэтага трэба стварыць неабходныя ўмовы. Адна з іх — жыллё, камфортныя ўмовы жыцця, зарплата. Гэта матэрыяльная частка. Але ж ёсць другі складнік — творчая атмасфера ў калектыве, каб у спецыяліста была магчымасць удасканальвацца. Работа з кадрамі важная на ўсіх этапах, няхай гэта будзе пачатковец, малады спецыяліст ці людзі, якія становяцца прафесіяналамі, кіраўнікамі. Трэба паэтапна вучыць, выхоўваць, каб яны маглі займаць сур'ёзныя пасады ў кіраўнічым апараце, на вытворчасці ў розных структурах, сацыяльнай сферы».

Сейбіт — на ніву, збожжа — у зямлю

Фота БелТА.

На Магілёўшчыне стартавала сяўба. Пасяўную кампанію распачалі народным абрадам «Засеўкі», які правялі ў Асіповіцкім раёне. Першымі ў вобласці ў палі выйшлі механізатары ААТ «Асіповічыаграпрамтэхзабеспячэнне». Спачатку — з сявенькамі, каб аддаць даніну традыцыі, што запраграмавана на добры ўраджай, а пасля — на сучасных энерганасычаных трактарах.

Спецыяльны рэпартаж

УЕЦЦА РЭЙКАМІ ЖЫЦЦЁ

Сёння грамадскі транспарт, як і некалькі дзесяцігоддзяў таму, з'яўляецца асноўным сродкам перамяшчэння для вялікай колькасці людзей. І калі апошнім часам сістэма транспартных зносін удасканальваецца і атрымлівае новыя формы, такія як электробусы і наземнае метро, то ў культурнай сталіцы Беларусі — Віцебску — дагэтуль можна акунуцца ў гарадскую рамантыку і пракаціцца на трамваі. Карэспандэнт «Звязды» выправілася ў рэйкавую вандроўку па горадзе на Дзвіне і даведалася, чаму каляровыя вагоны так прывабліваюць жанчын-кіроўцаў.

СТАР. 4

Сезон

БЯРОЗАВІК З ДАСТАЎКАЙ

На Брэстчыне вядуць нарыхтоўку і рэалізацыю гаючага напітку

Бярозавы капеж заўсёды становіцца першым сведчаннем таго, што наступіла вясна. Дрэвы прачынаюцца ад зімовага сну і спяшаюцца напаіць гаючай вільгаццю галіны і лісточкі, што неўзабаве распусцяцца. Пачынаецца сезон нарыхтоўкі соку. І першымі ў краіне традыцыйна выходзяць на дзялянкі брэсцкія лесаводы. У лясніцтвах ужо тыдзень кіпіць работа.

СТАР. 3

КАРАТКА

- **Камбайн «Гомсельмаша» і тры мадэлі трактароў «Беларус» прадстаўлены на міжнародной выстаўцы ў Малдове.**
- Факсімільнае Евангелле Дастаеўскага прадставілі на кніжнай выстаўцы-кірмашы ў Мінску.
- **Беларускія тэнісісты Ілья Івашка і Аляксандра Сасновіч з перамог стартавалі на турніры ў Маямі.**
- У КДК на нумар 191 можна паведаміць аб парушэннях у час пасяўной.
- **Тэхнікай «АМКАДОР» зацікавіліся ва Удмурцкай Рэспубліцы.**

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!
Ідзе падпіска на II квартал 2023 года
ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Блізкая ўлада

«Добры дзень. Вам тэлефануюць з Савета Рэспублікі...»

Наталля КАЧАНАВА правяла прамую тэлефонную лінію ў фармаце «званок ад спікера»

Гэта новы фармат работы з насельніцтвам, які паказаў эфектыўнасць на практыцы. 23 лютага Наталля Качанава праводзіла асабісты прыём грамадзян. Ён праходзіў па папярэднім запісе, але ахвотных звярнуцца па дапамогу да спікера было, як заўсёды, шмат. Прыём доўжыўся 12 гадзін, пытанні астатніх заяўнікаў таксама былі ўзяты на кантроль. У прыватнасці, учора ў многіх з іх была магчымасць пагутарыць з Наталляй Качанавай па тэлефоне.

Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі адразу запэўніла заяўнікаў: нягледзячы на тое, што размова ідзе па тэлефоне, гэта ніяк не адаб'ецца на якасці разгляду пытання.

У прыватнасці, учора спікер стэлефанавалася з Ліліяй Захараўнай з Мінска. Жанчына — апякун дваіх дзяцей пасля смерці сястры. Старшыня Савета Рэспублікі пасля сустрэчы на адным з мінскіх заводаў дапамагла з жыллёвым пытаннем хлопчыку. Пасля таго, як ён вызваліў пакой у блоку інтэрната завода, яго сястру-інваліда высяляюць адтуль. Мінчанка папрасіла дапамагчы застацца ў блоку.

«Я разбяруся асабіста, і мы з вамі звяжамся. Пастараюся вам дапамагчы», — адзначыла спікер і тут жа звязалася з дырэктарам прадпрыемства. Пытанне вырашылася літаральна на працягу хвіліны. Блок у інтэрнаце застаецца за гэтай сям'ёй.

Мінчанка Лілія Яўгенаўна звярнулася па пытанні зносу дома на вул. Папаніна, 16 і паляпшэнні жыллёвых умоў. Тады на прыём запісаўся яе сусед, але сёння жанчына вырашыла сама паразмаўляць са спікерам, каб дэталёва раскрыць сутнасць пытання.

У Любові Рыгораўны з Бабруйска ўзніклі цяжкасці з лячэннем сына. Яна просіць правесці паўторнае медабследаванне і вызначыцца з дыягназам, паколькі медыкаментознае лячэнне не падыходзіць. Наталля Качанава папрасіла кіраўніцтва РНПЦ «Навінкі» ўзяць пытанне на кантроль і шпіталізаваць хлопца.

Ірына Фёдараўна з Мінска папрасіла аказаць садзейнічанне сацыяльнаму праекту інтэграцыі і сацыяльнай адаптацыі маладых людзей з аўтызмам і іншай цяжкай інваліднасцю.

Спікер нагадала: пры Савеце Рэспублікі эфектыўна працуе экспертны савет па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Мы ўжо тры пасяджэнні правялі, — адзначыла Наталля Качанава. — Запрашаю вас прыняць удзел у наступным пасяджэнні. За 4 месяцы мы столькі зрабілі цікавага. Дзяржава робіць шмат у гэтым напрамку, але калі чалавек асабіста сутыкаецца з сітуацыяй, то на месцах часам рашэнне зацягваецца. Мы знайшлі форму, калі, вырашаючы гэтыя пытанні на асабістых прыкладах, мы дапамагаем астатнім, хто сутыкаецца з такімі сітуацыямі».

Як растлумачыла **начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Кацярына РЭЧЫЦ,** асаблівасць гэтай прамой тэлефоннай лініі заключаецца ў тым, што званок заяўніку паступае напрамую ад спікера ва ўзгоднены з грамадзянінам час.

Як заўсёды, пытанняў да Наталлі Качанавай паступіла вельмі шмат. Яны датычыліся абсалютна ўсіх сфер жыцця: жыллёвых пытанняў, працаўладкавання, пенсіённага забеспячэння да пытанняў удасканалення заканадаўства і яго інтэрпрэтацыі.

«Усе пытанні разглядаюцца гэтаксама ўважліва, адказна і будуць даведзены да лагічнага завяршэння, як калі б гэтыя людзі звярнуліся ў ходзе асабістага прыёму, — удакладніла Кацярына Рэчыц. — Гэта значыць, усе пытанні будуць знаходзіцца на асабістым кантролі ў Савеце Рэспублікі. Такі фармат практыкуецца не першы раз, і ён сябе вельмі добра зарэкамендаваў. Па водгуках людзей ім вельмі падабаецца такая форма ўзаемадзеяння. Гэта вельмі зручна, таму што людзі загадзя ведаюць час, у які яны змогуць сваё пытанне абгаварыць. І, вядома ж, вынік іх задавальняе, таму што пытанне разглядаецца ў такім жа агульным парадку, як і любы іншы зварот, што паступае ў Савет Рэспублікі. Гэта значыць, усе звароты грамадзян будуць разгледжаны ў тым фармаце, які найбольш прымальны і зручны для бакоў».

БелТА.

У Год міру і стваральнай працы — пра мір

Чарговымі наведвальнікамі Палаца Незалежнасці сталі дзеці і тыя, хто большасць часу праводзіць у небе

Вядома, дэлегацыю авіякампаніі «Белавія» і Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» прадстаўлялі не толькі пілоты і сцюардэсы. На экскурсію ў Палац Незалежнасці завіталі прадстаўнікі шматлікіх падраздзяленняў авіякампаніі «Белавія»: ад спецыялістаў да кіраўнікоў службаў і аддзелаў, ад маладых спецыялістаў, якія нядаўна пачалі свой шлях у авіяцыі, да супрацоўнікаў, чый стаж работы супадае з «узростам» Нацыянальнага аэрапорта — летась ён адзначыў 40-годдзе з дня заснавання.

У групу, якая прыбыла на экскурсію ў Палац Незалежнасці крыху раней, увайшлі лаўрэаты і пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Мір у душы — мір у краіне!», а таксама кіраўніцтва Беларускага фонду міру, актывісты арганізацыі.

Як прызнаўся **старшыня Беларускага фонду міру Максім МІСЬКО,** для дзяцей, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе «Мір у душы — мір у краіне!», магчымасць пабываць у Палацы Незалежнасці стала найлепшым падарункам. Па яго словах, сюды прыехалі найлепшыя школьнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Ім было прапанавана напісаць сачыненне, верш, стварыць малюнкі на тэму «Мір у душы — мір у краіне!». У выніку з 10 тысяч школьнікаў, якія прынялі ўдзел у гэтай рабоце, адабралі пераможцаў і лаўрэатаў. Усе яны трапілі на экскурсію ў рэзідэнцыю Прэзідэнта.

— Гэта вялікая падзея як для Фонду міру, так і для гэтых дзяцей, свайго роду стымуляцыйны фактар для далейшай творчай работы, — падкрэсліў Максім Міська. — Вельмі важна: дзеці бачаць, што для нас, дарослых, іх работы многае значаць... Пасыл, дадзены кіраўніком дзяржавы падчас аб'яўлення Году міру і стваральнай працы, патрэбен нам сёння для таго, каб кожны задумаўся, што асабіста ён можа зрабіць дзеля захавання міру, што ён павінен рабіць для таго, каб гэты мірны стан нашага жыцця заўсёды быў з намі.

Ахвотных наведаць Палац Незалежнасці, які з'яўляецца рэзідэнцыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, заўсёды вельмі шмат. І нядзіўна: гэтае найпрыгажэйшае збудаванне амаль у цэнтры сталіцы па праве стала візіткай Беларусі. Нягледзячы на тое, што Палац з'яўляецца адным з асноўных працоўных месцаў кіраўніка дзяржавы, тут рэгулярна сустракаюць замежных гасцей, прымаюцца найважнейшыя для краіны рашэнні і праводзяцца мерапрыемствы самай рознай тэматыкі, — рэзідэнцыя Прэзідэнта адчынена для звычайных беларусаў і не толькі. Зрабіць Палац даступным для простых людзей было асабістым патрабаваннем кіраўніка дзяржавы. Толькі ў мінулым годзе тут пабывала звыш сямі тысяч чалавек, і гэта толькі падчас экскурсій.

Як расказала **вучаніца 10 класа сярэдняй школы № 13 г. Баранавічы Мілена ЮРЧЫК,** у Палац Незалежнасці, дзе, па яе словах, прысутнічаць вялікі гонар, дзеці прыехалі не з пустымі рукамі. Па выніках конкурсу «Мір у душы — мір у краіне!» была выдадзена трылогія «Краіна міру». Адзін з экзэмпляраў пераможцы прывезлі з сабой, каб перадаць кіраўніку дзяржавы. Мілена выйграла конкурс у намінацыі «Верш». Яе твору «Малітва за Беларусь» высокую ацэнку даў сам уладыка Веніямін. Падзялілася школьніца і ўражаннямі ад наведвання Палаца Незалежнасці: «Вельмі грандыёзны і прыгожы будынак. Адчуваецца атмасфера месца, дзе вырашаюцца самыя важныя пытанні».

Не прасякнуцца атмасферай Палаца немагчыма. Гэта заўважалі як дарослыя, так і юныя наведвальнікі. Не можа не ўражваць ужо сам факт таго, што замест запланаваных 57 месяцаў Палац Незалежнасці быў пабудаваны роўна за 30 месяцаў. Звярталі ўвагу прысутныя і на атмасферу залаў, кожная з якіх выконвае асноўныя прадстаўнічыя функцыі. Гэта і зала ўрачыстых цырымоній, і зала, якая афіцыйна завецца «зялёнай»: менавіта тут у лютым 2015 года праходзілі 17-гадзінныя перагаворы «нармандскай чацвёркі», ад якіх залежаў, ці будзе ва Украіне мір. Гэта і камінная зала, якая прызначана для правядзення міжнародных сустрэч, і зала ўручэння дзяржаўных узнагарод, і зала, якая выкарыстоўваецца толькі падчас правядзення адной цырымоніі — уручэння даверчых грамат, якія прымае ад паслоў кіраўнік дзяржавы. І гэта яшчэ далёка не ўсё, што абмяркоўваюць дзеці пасля экскурсіі. Свае ўражанні ад наведвання Палаца Незалежнасці **вучань 11 класа адной са школ г. п. Бешанковічы Дзмітрый ПЕРАПЯЛІЦЫН** назваў вялізнымі, як і сам Палац. «Кожная зала ўражвае, у кожнай ёсць нешта асаблівае», — перакананы юнак.

Вераніка КАНЮТА.

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Штотыдзень традыцыйна для вырашэння праблемных пытанняў насельніцтва аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам праводзяць прамыя тэлефонныя лініі.

Прамыя тэлефонныя лініі ў суботу, 25 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА. Тэл. (016) 2269926;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. (021) 2222222;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. (023) 2331237;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. (015) 2735644;

• старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. (022) 2501869;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. (017) 5004160;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. (017) 2224444.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Інфляцыя ў Вялікабрытаніі паскорылася да 10,4 працэнта

Спажывецкія цэны ў Вялікабрытаніі ў лютым узраслі на 10,4 працэнта. Пра гэта сведчаць даныя Нацыянальнага статыстычнага ўпраўлення (ONS) краіны. Такім чынам, інфляцыя паскорылася ў параўнанні з 10,1 працэнта ў студзені. Пры гэтым аналітыкі чакалі запаволення росту цэн да 9,9 працэнта, сведчаць вынікі апытання Trading Economics. Паскарэнне інфляцыі было адзначана ўпершыню за чатыры месяцы і абумоўлена істотным ростам цэн у рэстаранах і гасцініцах (на 12,1 %, максімальны скачок з чэрвеня 1991 года). Акрамя таго, кошт прадуктаў харчавання і безалкагольных напояў узляцеў на 18 працэнтаў, што з'яўляецца самым істотным прыростам са жніўня 1977-га. Адзенне і абутак падаражэлі на 8,1 працэнта, алкаголь і тытунёвыя вырабы — на 5,7 працэнта, транспартныя паслугі, уключаючы паліва, — на 2,9 працэнта. Аплата жылля і камунальных паслуг павысілася на 26,6 працэнта.

Штогод 1,4 мільёна чалавек паміраюць з-за антысанітарыі і недахопу чыстай вады

Каля 1,4 млн чалавек у свеце штогод паміраюць з-за антысанітарыі і дэфіцыту чыстай вады. Пра гэта гаворыцца ў новым дакладзе Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ), паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. У дакладзе адзначаецца, што 2 млрд чалавек у свеце не маюць доступу да бяспечнай пітной вады, а 3,6 млрд чалавек — да сродкаў санітарыі. Адзначаецца, што мільёны дзяцей і дарослых не могуць скарыстацца нават такім базавым санітарна-гігіенічным сродкам, як мыла. У многіх медыцынскіх установах, дзе асабліва важна выконваць правілы гігіены, няма вады і спіртавых растворaў для дэзынфекцыі рук. Эксперты папярэджваюць, што сацыяльныя і эканамічныя наступствы адсутнасці чыстай вады і санітарна-гігіенічных сродкаў будуць катастрафічныя. Пры гэтым спецыялісты звяртаюць увагу на рост колькасці экстрэмальных і працяглых засух, якія пагаршаюць водны крызіс.

Навукоўцы расшыфравалі ДНК Бетховена, але не змаглі дакладна вызначыць прычыну яго смерці



Група даследчыкаў з Кембрыджскага ўніверсітэта на чале з Трыстанам Бегам прааналізавала пасмы валасоў Бетховена, якія захоўваліся ў прыватных калекцыях (усяго пасмаў было 8, але аўтэнтычнымі прызналі толькі 5), і на аснове геннай секвенцыі прыйшла да высновы аб тым, ад якіх захворванняў пакутаваў кампазітар, паведаміла «Бі-бі-сі». За два стагоддзі прыйсці да адназначнай высновы аб прычынах яго смерці так і не ўдалося. Не змаглі гэта з поўнай упэўненасцю зрабіць і навукоўцы з Кембрыджа, аднак яны высветлілі: у Бетховена была генетычная схільнасць да захворванняў печані (што пагаршалася прыхільнасцю да алкаголю), а ў канцы жыцця ён быў інфіцыраваны гепатытам В. Навукоўцы мяркуюць, што рэальнай прычынай смерці магла стаць сукупнасць фактараў, і больш дакладна гэта змогуць высветліць далейшыя даследаванні.

БЯРОЗАВІК З ДАСТАЎКАЙ

НА ПЛЯЦОЎЦЫ ЛЯСГАСА

Нарэшце і ў Брэсце паявілася магчымасць купіць карысны напітак, не выязджаючы з горада. «Не прайшло і дзясятка гадоў, — жартуе муж, — як цябе пачулі». Маецца на ўвазе, што я пісала на дадзеную тэму і пяць, і больш гадоў таму, прыводзіла як прыклад вопыт Старобінскага, Ваўкавыскага, іншых лясгасаў, якія даўно арганізоўвалі продаж соку для насельніцтва на гандлёвых пляцоўках гарадоў. А нашы наракалі то на завышаныя патрабаванні санітарных службаў, то на ... «адсутнасць скаргаў з боку насельніцтва на адсутнасць арганізацыі продажу соку». Праўда, ужо летась пустую нішу часткова запоўнілі спрытныя прыватнікі: хлопцы нарыхтоўвалі сок у лясгасах і дастаўлялі па заяўках у сецівe. Такім чынам дастаўшчыкі атрымлівалі неблагі даход, а людзі — магчымасць паспытаць вясну на смак. На іх паслугі былі немалыя чэргі.

І вось нарэшце справа зрушылася. Брэсцкі лясгас аб'явіў на сваім сайце, што з 13 да 18 гадзін грамадзяне могуць набываць сок на гандлёвай пляцоўцы Брэсцкага лясгаса па вуліцы Кобрынскай. Кошт за літр складе 36 капеек.

Прыязджаем акурат у 13 гадзін, сок ужо актыўна адпускаюць. У чарзе стаіць каля дзясятка чалавек. Аказалася, бярозавік прывезлі некалькі гадзін таму. Гэты перасоўны «магазін» складае вялікі грузавік МАЗ, у кузаве якога ўстаноўлены тры пластыкавыя ёмістасці па тоне кожная. Зранку супрацоўнікі лясніцтва збіраюць сок, напаўняюць пасудзіны і прывозяць.

— Калі падвязуць, тады і пачну адпускаць, — адказвае супрацоўнік лясгаса Максім, якому даручылі рэалізацыю, на пытанні пра распарадак на заўтра. — Сёння прадаём першы дзень (22 сакавіка. — **Аўт.**), пакупнікоў хапае.

Працэс тут арганізаваны добра. Людзі падыходзяць са сваёй тарай, прадавец адкручвае кран, устаўляе шланг у бітон ці бутлю. Пакуль запаўняецца вялікая тара, ён паспявае разлічыць пакупніка і выдаць чэк. Апошні з'яўляецца дакументам для вартаўніка, які падніме шлагбаум на выездзе. Усе заязджаюць на пляцоўку машынамі, бо купляюць па 40, 50, 60 літраў. Ёсць ахвотныя набыць і 200 літраў, аб чым спрабуюць дамовіцца па тэлефоне з прадаўцом. Ім раяць прыязджаць з раніцы. Праўда, адна жанчына папрасіла без чаргі прадаць ёй літр соку. Усе заўсміхаліся і, вядома ж, прапусцілі не зусім звычайнага пакупніка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І ПРАГУЛКА, І ДОБРАЯ СПРАВА

А вось суседзі мае аддалі перавагу ранейшаму спосабу нарыхтоўкі — у лясніцтве. Выбралі найбліжэйшае ад Брэста, дакладней, ад нашага мікрараёна лясніцтва — Мухавецкае, якое забяспечвае сокам многіх гараджан. Спачатку, вядома, запісаліся па тэлефоне, пазначаным на сайце. Патэлефанавалі яшчэ перад выхаднымі, каб быць сярод першых. Іх запрасілі прыязджаць у аўторак у другой палове дня. Пётр і Валянціна — пенсіянеры, ім падыходзіць любы час, таму ўзялі ўнукаў і накіраваліся да вёскі Забалацце, як і было сказана тым, хто запісваў. У прызначаны час пад'ехаў нарыхтоўшчык, зверыў усіх па прозвішчах у сваім тэлефоне і падаў знак рухацца за ім. У лесе хутка размеркаваў кліентаў па дзялянках, там яны самі хадзілі між бярозамі, адвязвалі мяшкі, напаўнялі свае пасудзіны.

— Мы бралі 80 літраў, — расказвае Валянціна, — сабе, дзецям, унукам папіць, крыху кансервую — адным словам, хопіць. На дзялянцы справіліся за гадзіну, а яшчэ пагулялі ў лесе, надвор'е было хоць і не надта сонечнае, але даволі прыемнае, лясным паветрам падыхаць пасля гарадскога аказалася задавальненнем. Адным словам, атрымалася і прагулка, і карысная справа. Праўда, потым правялі падрабязны ўзаемаагляд на прадмет кляшчоў: супрацоўнікі лясніцтва папярэджвалі аб неабходнасці такой працэдуры.

Паводле слоў Валянціны, людзей на лясной дзялянцы было нямала, многія стараюцца скарыстаць магчымасць і нарыхтаваць карысны прадукт. Літр у лясніцтве каштуе 0,195 рубля.

У ПРАМЫСЛОВЫХ МАШТАБАХ

— Нарыхтоўку соку распачалі ўсе лясгасы Брэсцкай вобласці, — паведаміў **вядучы інжынер аддзела вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Брэсцкага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Мікалай ПАШКЕВІЧ.** — Значныя партыі ўжо ў першыя дні нарыхтоўчай кампаніі адгрузілі перапрацоўшчыкам Лунінецкі, Пружанскі, Пінскі, Драгічынскі, Кобрынскі лясгасы. Скажам, Пінскія лясніцтвы адгружаюць сыравіну гродзенскай фірме «АВС», Маларыцкаму кансерваваму заводу, Мінскаму заводу безалкагольных напіткаў. У Гродзенскую вобласць пастаўляе сок і Лунінецкі лясгас.

Калі надвор'е паспрыяе, у рэгіёне маюць намер нарыхтаваць каля 4 тысяч тон бярозавіку. Каля 700 тон плануюць прадаць насельніцтву. Продаж бярозавага соку насельніцтву ў шэрагу раёнаў праводзіцца як на лясных дзялянках, так і на гандлёвых пляцоўках лясгасаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

❍ У тэму

Пра лекавыя ўласцівасці бярозавіку пішуць сёння не толькі традыцыйныя СМІ ды інтэрнэт-рэсурсы, але і папулярныя айчынныя ды замежныя блогеры. Нават зорныя артысты расказваюць рэйтынгавым тэлевядучым, як адмаўляюцца ад какосавай вады і пераходзяць на бярозавую. Аматары здаровага ладу жыцця са спасылкай на медыкаў даводзяць, што бярозавы сок у сезон здольны грунтоўна «прачысціць» арганізм, толькі ўжываць яго трэба свежым. А пры захворваннях страўніка, нырак, мочакаменнай хваробе ўрачы рэкамендуюць піць бярозавік курсам хоць бы на працягу 10—14 дзён. Ды і ўсім ён, несумненна, будзе карысны ў нашых шыротах, бо продкі пілі яго з даўніх часоў.

Вельмі смачнымі і духмянымі атрымаюцца кава і чай, звараныя на бярозавым соку. Пішу пра тое, што шмат гадоў праверана на сабе. А яшчэ мая даўняя знаёмая, нарыхтоўшчыца з Жабінкаўскага раёна Людміла Козіч некалі развеяла міф, увасоблены ў «Новай зямлі», аб тым, што нельга клёцкі варыць на бярозавым соку. Людміла Мікалаеўна варыць усё на соку — яны нават у лагер на час нарыхтоўкі не бяруць пітную ваду. Кажа, што боршч атрымліваецца асабліва духмяным, а пельмені або варэнікі яшчэ лепш раскрываюць свой смак.

Чытацкі вопыт і густ

Крытэрыі, якімі кіруюцца пры набыцці кніг наведвальнікі кніжнай выстаўкі-кірмашу

Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі правёў аператыўнае анлайн-апытанне наведвальнікаў XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Падчас даследавання выяўляліся найбольш перспектыўныя варыянты прасоўвання выстаўкі, вывучаліся меркаванні і ацэнкі па пытаннях яе арганізацыі, а таксама чытацкія перавагі яе наведвальнікаў.

Вынікі праведзенага апытання паказалі, што інфармацыю аб правядзенні выстаўкі-кірмашу яе наведвальнікі атрымалі ў першую чаргу з інтэрнэт-сайтаў, парталаў і ад сяброў, свякоў, калег па рабоце (па 23,8 %), а таксама з рэкламных паведамленняў, якія транслююцца па тэлебачанні (22,8 %). Пры адказе на пытанне «Колькі разоў вы ўжо наведвалі Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш?» 42,5 % удзельнікаў апытання адзначылі, што наведваюць яе рэгулярна, амаль чвэрць рэспандэнтаў (23,8 %) паведаміла, што былі на некалькі выстаўках, а кожны трэці апытаны (33,7 %) прыйшоў на выстаўку ўпершыню. У якасці важных момантаў наведвання кніжнай выстаўкі-кірмашу рэспандэнты называюць перш за ўсё атрыманне інфармацыі аб кніжных навінках (40,5 %), выдавецтвах (36,4 %) і набыццё кніг па нізкай цане (36,1 %).

Больш за палову ўдзельнікаў апытання (54,8 %) збіраецца набыць на выстаўцы мастацкія кнігі. Кожны чацвёрты (25,5 %) плануе купіць гістарычныя кнігі, а кожны пяты (20,7 %) — навукова-папулярныя. Пры набыцці новых кніг 64,3 % удзельнікаў апытання абапіраюцца перш за ўсё на свой чытацкі вопыт і густ. Купляючы кнігі, рэспандэнты таксама кіруюцца рэкамендацыямі сяброў, сваякоў, калег (25,9 %), дызайнам (22,4 %) і коштам (19,7 %) кніг, рэкамендацыямі кніжных крытыкаў, блогераў (17,0 %), папулярнасцю кніг (16,7 %). Абсалютная большасць удзельнікаў апытання (89,1 %) аддае перавагу кнігам у друкаваным фармаце. Электронныя кнігі выбіраюць толькі 8,2 % рэспандэнтаў, а аўдыёкніжкі — 2,4 %.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Надвор'е

На выхадныя цёпла, а ў канцы месяца — не вельмі

Дажджы з узмацненнем ветру і 10—17 цяпла — такое надвор'е чакаецца на выхадныя, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Паводле прагнозу сіноптыкаў, да канца гэтага тыдня і ў пачатку наступнага тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца ва ўладзе атмасферных франтоў, якія ідуць з Заходняй Еўропы. Таму без адпадкаў у выглядзе дажджу не абыдзецца. Тэмпературны фон па-ранейшаму павышаны.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У ранішнія гадзіны па паўночным усходзе на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 градусаў вышэй за нуль, удзень — 11—17 градусаў цяпла.

У суботу таксама дажджы. Уначы месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 градусаў вышэй за нуль, удзень — 10—16 градусаў цяпла. У нядзелю ў многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы — 2—9 градусаў вышэй за нуль, удзень — 8—14 градусаў цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у панядзелак ноччу месцамі пройдуць невялікія дажджы, днём ападкі (у асноўным дождж) чакаюцца на большай частцы тэрыторыі краіны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 градусаў вышэй за нуль, пры праясненнях — ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень будзе 7—13 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 15 градусаў.

А да красавіка цяпло ў дамах не адключаць

Такую выснову зрабіла **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Белгідрамета Таццяна ЧЭТЫРКА.** Чаму? Згодна з саюзнай праграмай, доўгатэрміновыя прагнозы нам дапамагае распрацоўваць расійскі Гідрамет. Дык вось, у канцы сакавіка — пачатку красавіка нас чакаюць зусім не вясёлыя дзянькі. Ужо 28 сакавіка атмасферны фон павінен істотна панізіцца. У гэты дзень у нашу краіну пачне паступаць вельмі халоднае паветра са Скандынавіі, таму начныя і ранішнія замаразкі ад нас яшчэ нікуды не «ўцяклі». Як вынік — тэмпература паветра будзе на некалькі градусаў ніжэйшай за кліматычную норму.

Так, цяпер сапраўды пахне вясной, калі тэмпература паветра ў разрэзе краіны падымаецца да 11—19 цяпла. Аднак камунальныя службы ўжо папярэджаны, што 29 сакавіка ў разгар дня тэмпература паветра не будзе падымацца вышэй за 0 — плюс 7 градусаў. А пры такой тэмпературы цяпло не адключаюць.

Нам не дапамагаюць, а мы і «не плачам»

Акрамя таго, у складаных міжнародных умовах Белгідрамет умудрыўся павысіць дакладнасць прагнозаў надвор'я. Як паведаміла на брыфінгу **першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана КУЗЬМІЧ,** сярэдняя апраўдвальнасць прагнозаў надвор'я на наступныя суткі па абласцях у 2022 годзе была 98,2 % (у 2021 годзе 97,8 %).

«Апраўдвальнасць кароткатэрміновых прагнозаў надвор'я па абласных цэнтрах — 95,6 % (раней 94,3 %), гідралагічных прагнозаў — 97,6% (да гэтага было 97,3 %), аграметэаралагічных — 92 % (раней 91,9 %), прагнозаў ураджайнасці — 91,5 % (раней 90,8 %)», — сказала Святлана Кузьміч.

Яна адзначыла, што мінулы год быў вельмі няпросты для гідраметэаралагічнай службы. «Мы страцілі частку сінаптычнай інфармацыі, якая прыходзіла з заходніх краін, перасталі атрымліваць данныя ад Еўрапейскага цэнтра сярэднетэрміновых прагнозаў надвор'я. Але той зачын, які быў забяспечаны ў папярэднія гады мадэрнізацыяй гідраметэаралагічнай сеткі, павышэннем кваліфікацыі метэаролагаў, дазволіў нам вытрымліваць высокую планку ў апраўдвальнасці прагнозаў надвор'я», — падкрэсліла першы намеснік начальніка Белгідрамета.

Сяргей КУРКАЧ.

УЕЦЦА РЭЙКАМІ ЖЫЦЦЁ

З гісторыі

Віцебск нездарма называюць радзімай беларускага трамвая. Яго гісторыя пачалася ў далёкім 1896-м, менавіта тады Віцебская ўправа заключыла дагавор з грамадзянінам Францыі Фернанам Гільёнам. У ёй было сказана, што Гільён атрымлівае канцэсію на будаўніцтва і эксплуатацыю трамвая ў Віцебску на 40 гадоў. Ён павінен быў пабудаваць за свае грошы электрычную чыгунку з усім неабходным для яе абсталяваннем, уключаючы электрастанцыю магутнасцю 425 кВт. Дарэчы, будаўніцтва гэтай электрастанцыі стала неверагоднай удачай для горада: з яе дапамогай асвятляліся губернатарскі палац, штаб Дзвінскай ваеннай акругі, суд, гасцініца, лазарэт і тэатр.

У маі 1898-га першы трамвай выехаў на маршрут. Што паказальна, у Маскве гэты від транспарту стаў выкарыстоўвацца толькі праз год, а ў Санкт-Пецярбургу — праз дзевяць гадоў. Віцебскі трамвайны парк складаўся з 18 маторных і 16 прычапных вагонаў, а даўжыня маршруту была ўсяго 5,1 кіламетра. Цікавы факт: у пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя ў ганаровыя машыністы Віцебска быў прыняты Уладзімір Ільіч Ленін.

Сёлета паўночная трамвайная дынастыя спраўляе 125-гадовы юбілей, а каляровыя электрычныя вагоны і дагэтуль штодзённа выходзяць на свае маршруты. Віцебскі трамвай з'яўляецца не толькі неад'емным элементам гарадской інфраструктуры, але і амаль унікальным відам транспарту: на сённяшні дзень толькі ў чатырох гарадах Беларусі — Мінску, Віцебску, Мазыры і Наваполацку — працуе гэты сродак зносін. А тым, хто хоча не толькі пракаціцца па вуліцах культурнай сталіцы, варта зазірнуць у Музей гісторыі віцебскага трамвая, які размяшчаецца ў трамвайным дэпо.

Неабсяжная прастора па-за шклом

Пракаціцца па маршруце № 2 мяне запрасіла кіроўца Таццяна Герман, якая працуе ў трамвайным дэпо ААТ «Віцебскаблаўтатранс» ужо шаснаццаты год. Сёння ў экіпажы з Таццянай Мікалаеўнай шчыруе кандуктар, таму мы можам паразмаўляць падчас руху.

Стаць кіроўцай вялікага транспарту Таццяна марыла з дзяцінства — любіла разам з бацькам выпраўляцца ў далёкія аўтобусныя падарожжы, але ў сілы свае дзявочыя моцна не верыла: здавалася, што да такой адказнай работы дапускаюць толькі мужчын. А пасля, калі працавала кандуктарам у тралейбусным дэпо, ёй прапанавалі скончыць адпаведныя курсы. «Я вагалася: абіраць тралейбус або трамвай, але свёкар падказаў, што мне, такой худзенькай, не справіцца з «рагамі», якія часта прыходзіцца папраўляць у тралейбуса. Цяпер жыцця свайго без вагона не ўяўляю», — расказвае жанчына.

Падабаецца Таццяне Мікалаеўне неабсяжная прастора, якая адкрываецца па-за шклом — тады яна адчувае сябе значнай для гэтага свету. А яно так і ёсць: на працягу доўгіх гадоў жанчына няспынна развозіць урачоў, ратавальнікаў, педагогаў, дзяцей. І гэта вельмі важна: усведамляць, што твая работа штодзённа дапамагае сотням не менш важных прафесій. «Гэта нялёгкая справа: ненармаваны графік, праблемы са здароўем, складанасці на дарозе. Без любові да прафесіі можна хутка здацца, але я люблю яе і кожны дзень саджуся ў кабіну з хваляваннем», — усміхаецца суразмоўніца.

Таццяна ГЕРМАН.

Яшчэ адзін адметны бок — работа з людзьмі, якая, вядома, не заўсёды мае пазітыўную афарбоўку. Але многія з пасажыраў другога маршрута ўжо ведаюць спадарыню Герман, вітаюцца і віншуюць са святамі, а яна, у сваю чаргу, часта чакае «сваіх» пасажыраў, якія не паспяваюць на трамвай.

За змену «двойкі» набягае 108 кіламетраў, у сярэднім трамвай паспявае зрабіць круг менш чым за гадзіну. Працуюць кіроўцы пазменна: з самае раніцы і з абеду. На першую змену прыходзіцца ўставаць каля 3 гадзін раніцы, каб да выезду ў 5 паспець дабрацца да дэпо, прайсці медагляд, атрымаць дазвол на работу вагона і пуцявы ліст. А вяртаюцца кіроўцы з апошняй змены дадому каля дзвюх гадзін ночы!

Але не бывае ліха без дабра: калісьці менавіта бясконцыя рэйкі пазнаёмілі Таццяну Мікалаеўну з мужам: ён таксама працуе ў дэпо на аварыйнай машыне. Дома з ненармаваным графікам Таццяны Герман звыкліся даўно. Надзейнае плячо ў хатніх справах ёй, акрамя мужа, падстаўляюць два сыны. Вось і мінулае 8 Сакавіка прайшло для жанчыны ў кабіне, пакуль мужчыны дома рыхтавалі святочны стол.

«Паветра» на сувязі

Тым, хто яшчэ не зазірнуў да кіроўцы праз акенца, варта ведаць, што ў трамвая няма стырна — яго ролю выконвае рычаг, які называецца «кантролер». Функцый у яго толькі тры: ход, тормаз і «нейтралка». Яшчэ цікава, што ўвесь маршрут трэба трымаць нагу на педалі экстраннага тармажэння: яно прымяняецца рэдка, тады вагон спыняецца хутчэй і раздаецца характэрны звон.

Яшчэ з цікавых кнопак на прыборнай панэлі — «пясочніца». У кожнага трамвая ёсць адсек, з якога пясок сыплецца на рэйкі, калі трамвай ідзе на юз. Назвы прыпынкаў, якія свецяцца ў салоне бягучай стужкай, таксама пераключае сам кіроўца. Пры неабходнасці (калі, напрыклад, у дарозе трамвай мяняе маршрут) выкарыстоўваюць мікрафон.

На сувязі з усімі кіроўцамі тралейбусаў і трамваяў заўсёды знаходзіцца дыспетчар, які прымае заяўкі аб неналежным стане дарогі, інфармуе пра здарэнні і змены. Па рацыі кіроўцы віншуюць адзін аднаго са святамі, але расказваць анекдоты ў дарозе нельга.

Вось і для нас прыйшло паведамленне ад дыспетчара з пазыўным «Паветра» аб здарэнні на плошчы Перамогі, аднак пакуль мы праехалі некалькі прыпынкаў, рэйкі былі вызвалены.

Абслугоўваннем трамваяў у дэпо займаюцца майстры, слесары-механікі, слесары-электрыкі, а за парадак і чысціню ў вагоне адказвае брыгада прыбіральшчыкаў. Уяўляеце, колькі вагонаў за ноч трэба прывесці ў парадак? Таму нам, пасажырам, трэба лішні раз падумаць: а ці варта ляпіць жвачку пад сядзенне?

Пра зайца і здарэнні

«Трамвай можа разагнацца да 80 кіламетраў у гадзіну, аднак гэта толькі ў мэтах эксперыменту. Звычайна вагон ідзе з хуткасцю 20-30 км/г. Але многія кіроўцы аўтамабіляў і пешаходы не разумеюць, што 18-тонная машына не можа спыніцца ўмомант», — працягвае знаёміць з прафесіяй Таццяна Герман.

Зіма і восень — напэўна, самы складаны час для кіроўцаў трамваяў. Узімку небяспеку ствараюць абледзянелыя рэйкі, часта стрэлкі не пераводзяцца аўтаматычна: прыходзіцца кожны раз на так званых перакрыжаваннях пераводзіць іх уручную. Восенню лісце пад коламі вагона «гарыць» і ператвараецца ў слізкую масу, праз якую трамвай ідзе на юз, а можа і сысці з рэек. Летам і цёплай вясной працаваць адна любата, асабліва калі раніцай горад яшчэ спіць.

«Наколькі часта пад трамвай выбягаюць пешаходы?» — пытаюся я. «Парадкам. Звычайна гэта падлеткі ў навушніках або тыя, што ўтаропіліся ў тэлефоны. Гэта вялікая праблема нашай моладзі сёння, бацькі павінны праводзіць рэгулярную работу з дзецьмі адносна правілаў паводзінаў на дарозе. Сваім сынам я не дазваляю перамяшчацца па горадзе ў навушніках, бо бачыла, чым такія гісторыі заканчваюцца», — расказвае Таццяна Мікалаеўна.

Але часта гісторыі з сумным канцом здараюцца не толькі з-за саміх пешаходаў. Напрыклад, трамвайныя прыпынкі з выхадам на дарогу — зона павышанай рызыкі, дзе людзі павінны быць максімальна ўважлівымі. Аднойчы на вачах у Таццяны аўтамабіль збіў дзяўчыну, якая спяшалася на трамвай. Цяпер кіроўца не адчыняе дзверы, пакуль сама не ўпэўніцца ў тым, што аўтаўладальнікі з абодвух бакоў спыніліся канчаткова.

Нягледзячы на тое што адносна аўтобусаў і тралейбусаў з удзелам трамвая менш за ўсё здараецца ДТЗ, перагароджваць рэйкі машынамі і «падразаць» вагон нельга — затрымка адной такой адзінкі грамадскага транспарту збівае агульны графік руху цэлага дэпо.

«Бываюць, вядома, і такія пешаходы, на якіх скардзіцца нельга. Аднойчы за адзін дзень сустрэла на рэйках на ўскраіне горада зайца і вожыка. Апошні, дарэчы, аказаўся вельмі кемлівы: пачакаў, пакуль я праеду, і пабег далей», — дзеліцца ўспамінамі жанчына.

Часта ў транспарце забываюць рэчы, але яны амаль заўсёды вяртаюцца да ўладальнікаў. Так, Таццяна Мікалаеўна знайшла і вярнула бацькам хлопчыка тэлефон, а вернутая жаночая сумачка адгукнулася не толькі шакаладкай і падзякай, але і прэміяй ад кіраўніцтва дэпо за чалавечнасць. Аб знаходках кіроўцы таксама паведамляюць дыспетчару па рацыі.

Некалькі гадоў таму на некаторых маршрутах абілечваць пасажыраў сталі самі кіроўцы, што значна ўскладніла рабочы працэс. І, напэўна, многіх турбуе пытанне: чаму такі білет на 5 капеек даражэйшы за той, што выдае кандуктар? Гэтую розніцу ніхто не кладзе сабе ў кішэню, кіроўцам толькі выпісваюць прэмію за выкананы план продажаў. Нягледзячы на павышаную ўвагу пры абілечванні, Таццяна Герман працуе без аварый, пацвярджэннем гэтаму з'яўляюцца выдадзеныя кіраўніцтвам пасведчанне і значок.

«Тэхніку трэба любіць такой, якая яна ёсць, слухаць і адчуваць — тады прафесія будзе прыносіць задавальненне», — усміхаецца Таццяна Мікалаеўна на развітанне.

Я сышла на прыпынку, а «двойка» пад надзейным кіраўніцтвам пяшчотных жаночых рук паехала далей насустрач новым уражанням.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Учреждение образования
«Белорусский государственный университет культуры и искусств»

ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС
на замещение следующих должностей:

ЗАВЕДУЮЩИЙ КАФЕДРОЙ

• кафедра народно-инструментальной музыки – 1 штатная единица.
Квалификационные требования: высшее образование, наличие ученой степени доктора или кандидата наук, научных трудов или изобретений, патентов, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей или специалистов, работа которых соответствует направлению образования кафедры, не менее 7 лет. Срок избрания – 5 лет.

ПРОФЕССОР

• кафедра музыкально-теоретических дисциплин – 1 штатная единица.
Квалификационные требования: высшее образование, наличие ученой степени доктора или кандидата наук, научных трудов или изобретений, патентов, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей или специалистов, работа которых соответствует направлению образования кафедры, не менее 7 лет. Срок избрания – 5 лет.

ДОЦЕНТ

• кафедра информационных технологий в культуре – 3 штатные единицы;
• кафедра менеджмента социально-культурной деятельности – 1 штатная единица;
• кафедра межкультурных коммуникаций и рекламы – 1 штатная единица;
• кафедра физической культуры – 1 штатная единица;
• кафедра музыкально-теоретических дисциплин – 1 штатная единица;
• кафедра народно-инструментальной музыки – 1 штатная единица;
• кафедра эстрадной музыки – 1 штатная единица.
Квалификационные требования: высшее образование, наличие ученой степени доктора или кандидата наук, научных трудов или изобретений, патентов, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей или специалистов, работа которых соответствует направлению образования кафедры, не менее 5 лет. Срок избрания – 5 лет.

СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ

• кафедра духовой музыки – 1 штатная единица.
Квалификационные требования: высшее образование и наличие степени магистра (высшее образование и наличие научной квалификации «Исследователь», высшее образование и наличие ученой степени), стаж работы в должностях педагогических, научных работников не менее 3 лет либо высшее образование и стаж работы в должностях служащих, относящихся к категории «Руководители» или «Специалисты», работа которых соответствует направлению образования, не менее 5 лет. Срок избрания – бессрочно.

ПРЕПОДАВАТЕЛЬ

• кафедра педагогики социально-культурной деятельности – 1 штатная единица;
• кафедра хоровой музыки – 2 штатные единицы;
• кафедра народно-инструментальной музыки – 1 штатная единица;
• кафедра эстрадной музыки – 4 штатные единицы.
Квалификационные требования: высшее образование и наличие степени магистра (высшее образование и наличие научной квалификации «Исследователь», высшее образование и наличие ученой степени), стаж работы в должностях педагогических, научных работников не менее 1 года. Срок избрания – бессрочно.

Дата и время проведения конкурса: 31.05.2023 в 10.00.
Место проведения конкурса:
г. Минск, ул. Рабкоровская, 17, каб. 207.
Срок подачи документов: **с 20.03.2023 по 28.04.2023**
по адресу: 220007, г. Минск, ул. Рабкоровская, 17,
отдел правовой и кадровой работы, каб. 6.
Контактный телефон **(017) 3739023.**
УНП 100286677

ИНФОРМАЦИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

Номер и наименование лота	Адрес и характеристики пустующего жилого дома	Начальная цена, рублей
Лот № 1 Пустующий одноквартирный жилой дом № 12 в д. Слуки	Минская область, Мядельский район, Нарочский сельсовет, д. Слуки, д. 12. Общая площадь дома – 25,8 кв. м, одноэтажный, одноквартирный жилой дом. Фундамент – бутовый, материал стен – бревно, деревянные перекрытия, крыша – шифер, отопление печное. Водопровод, канализация, газоснабжение отсутствуют, электроснабжение отключено. Степень физического износа – 54 %. Составные части и принадлежности: сарай бревенчатый со степенью физического износа 70 %	700
Дата, время и место проведения аукциона	**27 апреля 2023 г. в 11.00,** аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (зал заседаний), Нарочский сельский исполнительный комитет	
Извещение опубликовано	Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http https://www.minsk-region.gov.by ekonomika-i-finansy/pustuyushchie-doma) Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/item/756390) Официальный сайт Мядельского райисполкома http:// myadel.gov.by/ru/ukaz116-ru	

УНП 600097530

ИНФОРМАЦИЯ О ВНЕСЕНИЕ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИИ
о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона ООО «ИПМ-Консалт оценка» сообщает о внесении изменений в извещении от 22.03.2023 г. (газета «Звязда», Продавец: ООО «ТехноПластСнаб»).

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.04.2023 г. с 10.00 до 12.00.

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.04.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

УНП 191224638

ИНФОРМАЦИЯ О ВНЕСЕНИЕ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИИ
о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона ООО «ИПМ-Консалт оценка» сообщает о внесении изменений в извещении от 22.03.2023 г. (газета «Звязда», Продавец: ООО «Тео БиУай»).

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.04.2023 г. с 10.00 до 12.00.

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.04.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

УНП 191224638

ТЭАТР І ТЫЯ, ХТО СЛУЖЫЦЬ ЯМУ

Штогод 27 сакавіка адзначаецца Сусветны дзень тэатра. Мастацтву, якое раскрывае душу чалавека, паказвае яму жыццё, людзей і падзеі з рознымі акцэнтамі, а таксама асобам, што служаць яму, будзе прысвечаны і тэматычны эфір на «Беларусь 3» у панядзелак.

Пра тэатр будуць распавядаць з самага ранку ў праекце «Дабраранак». Вечарам праект «Асобы» раскажа пра Уладзіслава Галубка. Адразу пасля ўбачым оперу Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана (БТРК, 2022 г.). А пасля заканчэння «Калыханкі» на сацыякультурным тэлеканале пакажуць спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Паўлінка» (БТРК, 2021 г.).

Працягнецца знаёмства з тэатральным мастацтвам і яго выдатнымі прадстаўнікамі і ў апошнія дні месяца. Так, 28 сакавіка ў праграме «Кадры жыцця» госцем будзе мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргей Кавальчык. Убачым у студыі праграмы таксама сцэнарыста, рэжысёра тэатра і кіно Аляксандра Карпава, акцёра тэатра і кіно Віктара Рыбчынскага і іншых. У вячэрнім эфіры пакажуць спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Мікітаў лапаць», пастаўлены па п'есе М. Чарота. Значацца ў праграме да канца месяца і паказы такіх спектакляў, як пастаноўка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Адамавы жарты», спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа «Не пакідай мяне...» паводле Аляксея Дударава і спектакль «Сільва» Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Не прапусціце сваю сустрэчу з тэатральным мастацтвам.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 168

Сваю задачу даслаў нам Аляксандр Зелянко з Маладзечна ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крh1, Фf7, Лс2, Се2, Kb5, пп. d4, g3 (7).

Чорныя: Крd5, Лb1, Лe6, Сс1, Kd2, пп. b2, c7, d6 (8).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Працягнем расповед пра зладжаны выданнем па шахматнай кампазіцыі «Альбіна» міжнародны конкурс памяці беларускага складальніка Дзмітрыя Жылко. У раздзеле задач на кааператыўны мат удзельнічалі 54 кампазіцыі ад 21 аўтара з 9 краін. Арбітр Дзмітрый Турэўскі (Расія) адзначыў 19 задач.

Падраздзел двухходовак

Прызы: I — Віталь Медзінцаў і Анатоль Скрыпнік (Расія). Пачэсныя водгукі: I — Барыс Шорахаў і Павел Мурашоў (Расія); II — В. Медзінцаў; III — Янаш Кзак (Чэхія). Пахвальныя водгукі (як роўныя): Аляксандр Панкрацьеў (Расія); Габар Тар (Венгрыя).

Падраздзел трохходовак

Прызы: I — Кенан Велiханаў (Азербайджан); II — В. Медзінцаў; III — Я. Кзак. Пачэсны водгук — А. Панкрацьеў і Юрый Гарбаценка (Расія). Пахвальны водгук — Іван Анціпін (Расія).

Падраздзел шматходовак

Прызы: I і II — Златка Міхайлоскі (Паўночная Македонія). Пачэсныя водгукі: I — З. Міхайлоскі; II — Яўген Фамічоў (Расія); III — Міша Шапіра (Ізраіль). Пахвальныя водгукі (як роўныя): З. Міхайлоскі; Я. Кзак; А. Панкрацьеў і Ю. Гарбаценка.

* * *

На чэмпіянаце Еўропы ў Сербіі (484 гульцы) Сяргей Азараў заняў 21-е месца і заваяваў пуцёўку на наступны Кубак свету.

У Магілёве прайшлі Алімпійскія дні моладзі, дзе прызавую тройку склалі зборныя Магілёўскай, Гомельскай і Віцебскай абласцей.

У бліцтурнірах на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 9-е месца з 526 і 26-е з 519, Сяргей Жыгалка — 32-е з 417, 29-е з 519 і 22-е з 425. У вельмі моцным турніры па хуткіх шахматах на тым жа сайце Д. Лазавік быў восьмы са 150 удзельнікаў.

* * *

Прапануем дзве партыі з сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі ў вышэйшай лізе.

Яраслаў Навумовіч — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. d4 d5 2. c4 e6 3. Кс3 a6 4. cd ed 5. Фb3 Kf6 6. Cg5 c6 7. Kf3 Ce7 8. e3 Kbd7 9. Cd3 h6 10. Cf4 Kh5 11. 0-0 0-0 12. Ce5 K:e5 13. K:e5 Kf6 14. Лас1 Cd6 15. f4 c5 16. K:d5 C:e5 17. de K:d5 18. Ce4 Ke7 19. f5 Фc7 20. f6 Ф:e5 21. fe Ф:e7 22. Cd5 Ce6 23. Ф:b7 Фg5 24. e4 Лab8 25. Фc7 C:d5 26. ed Л:b2 27. Фg3 Ф:d5 28. Лfd1 Ф:a2 29. Л:c5 Ле8 30. Kph1 Лb1 31. Лсс1 Л:с1 32. Л:c1 Фd2 33. Лf1 Фd5 34. h3 a5 35. Фg4 h5 36. Фg3 Ле2 37. h4 Лd2 38. Лf3 Фd6 39. Лf4 Лd4, 0:1.

Варвара Палякова — Вераніка Абрамкіна. 1. e4 Kf6 2. e5 Kd5 3. d4 d6 4. Kf3 g6 5. Cc4 c6 6. 0-0 Cg7 7. Ле1 0-0 8. Cg5 Ce6 9. Фe2 h6 10. Cc1 Kc7 11. Kbd2 C:c4 12. K:c4 d5 13. Ke3 Ke6 14. c3 c5 15. dc K:c5 16. Лd1 e6 17. c4 Фc7 18. cd C:e5 19. Kg4 Cg7 20. d6 Фb6 21. K:h6+ Kph8 22. Ke5 C:e5 23. Ф:e5+ f6 24. Фg3 g5 25. Kg4 Kbd7 26. Фh3+ Kpg8 27. Фh5 Фb4 28. h4 gh 29. Ce3 e5 30. Kh6+, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Кс4! Правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук. М. Кошаль прапануе крыху змяніць пазіцыю (Ch8 — на g7, Cg3 — на h2, пешка a3 — на a6, дадаць чорную пешку h3), пасля чаго да рашэння дадаюцца падманныя сляды 1. Kb1? Лс7! і 1.Cg4? Ле7!

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

Класіка на матыў раманса

